Наталля ПЕТУХОВА
*(г. Мінск)*

# ВЫХАВАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ АБРАДАВА-СВЯТОЧНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

У нашы дні многія формы і мастацкія элементы абрадава-святочнай нацыянальнай культуры амаль страчаны. Гэтаму садзейнічаюць аб'ектыўныя прычыны: змяніліся ўмовы бытавання фальклору, яго функцыянальна-змястоўнае поле, кола носьбітаў традыцый. Праз некаторы час мы можам стаць сведкамі канчатковага разбурэння духоўнай сувязі сучаснікаў з культурнымі традыцыямі і творчым вопытам мінулых пакаленняў. Таму з кожным годам набірае моц фактар арганізаванай рэпрадукцыі, узнаўлення і трансляцыі маладому пакаленню ўзораў народнай спадчыны.

У навуковых колах досыць востра ставіцца пытанне аб аптымізацыі выхаваўчага патэнцыялу абрадава-святочнай культуры. Даследчыкі А. М. Аляхновіч, Н. П. Андрэева, В. С. Болбас, М. Ц. Картаўцава, Л. Л. Ражкова, Г. Б. Сакалова, В. І. Саладухін, В. А. Салееў і іншыя разглядаюць пытанне аб тым, як варта арганізаваць педагагіны працэс, каб фарміраванне асобы сродкамі абрадава-святочнай культуры адпавядала мэтам выхавання. Яны сцвярджаюць: педагагічныя асновы яе выкарыстання грунтуюцца на тым, што, прапаноўваючы не толькі лагічныя схемы паводзін, але і псіхалагічныя мадэлі, увасобленыя ў мастацкіх вобразах, абрадава-святочная культура перш за ўсё ўплывае на фарміраванне эмацыянальна-пачуццёвай сферы асобы: так, чалавек не проста запамінае і лагічна ўсведамляе пэўныя грамадскія патрабаванні і каштоўнасці, але і перажывае іх. На гэтай падставе яна арыентуе чалавека ў навакольным асяроддзі і абараняе, ствараючы бар'ер для негатыўных уздзеянняў.

Абрадава-святочная культура Беларусі акумулявала шматвяковую мудрасць народа, яго этнічныя і эстэтычныя ідэалы, маральна-этычныя ўяўленні, мастацкія дасягненні. Яна ўтрымлівае значны выхаваўчы патэнцыял, служыць фарміраванню нацыянальнага гонару, патрыятызму, кансалідацыі грамадства. Як адначасова мастацкі, жыццёвы і прыродна-ландшафтны феномен, які адлюстроўвае сінкрэтычнае спалучэнне разнастайных відаў фальклору, народныя абрады і святы зараз паступова ператвараюцца ў масавыя этнакультурныя падзеі, прыцягваючы да сябе ўвагу тысяч людзей. На Беларусі штогод амаль ва ўсіх буйных населеных пунктах масава святкуюцца Каляды, Масленіца, Гуканне вясны, Купалле, Дажынкі і г.д. На дадзеных святах актыўна выкарыстоўваюцца шматлікія формы агульных шэсцяў, карагодаў, гульняў, спеўна-размоўных формаў, танцаў, якія разлічаны на свабоднае далучэнне ўсіх жадаючых. Таму сучасны

парадак правядзення масавых народных урачыстасцей варта разглядаць як своеасаблівую выхаваўчую сістэму, якая забяспечвае арганічнасць і бесперапыннасць культурнага развіцця чалавека, непарыўную трансляцыю і пераемнасць мастацка-эстэтычнага вопыту.

Ацэнка вопыту правядзення народных абрадаў і свят на Беларусі дае падставы вылучыць асноўныя складаючыя абрадава-святочнай культуры. Па-першае – гэта сукупнасць традыцыйных формаў, якія гістарычна склаліся. Па-другое – гэта рэалізацыя ўменяў і навыкаў, сутнасных сіл асобы ўдзельніка і гледача ў дадзеных формах. Інакш кажучы, формы бытавання абрадава-святочнай культуры выступаюць не толькі як істотны фактар трансляцыі духоўных каштоўнасцей, забеспячэння пераемнасці пакаленняў і перадачы традыцый, але і як сродак стымулявання актыўнасці і самарэалізацыі асобы.

Перадача традыцый праз змест абрадаў і свят, уключэнне ў дзеянне прыродных аб'ектаў і помнікаў народнай архітэктуры – усё гэта прадугледжвае дзейнасць па іх захаванню, якая ажыццяўляецца праз рэалізацыю прынцыпу пераемнасці. Тым самым, глыбінныя пласты гісторыі нашай краіны, дзякуючы гэтай дзейнасці, асэнсоўваюцца з сацыяльна-псіхалагічных, педагагічных і мастацка-эстэтычных пазіцый.

Варта асобна спыніцца на дзейнасці, звязанай з далучэннем грамадзян да мерапрыемстваў. Відавочна, што яна функцыянуе выключна ў рамках адпачынкавай сферы і як дынамічны працэс мае на мэце ўключэнне асобы гледача ў абрадавую сітуацыю, яго пераход у катэгорыю саўдзельніка свята. Гэта патрабуе ад арганізатараў вывучэння чалавечых патрэбаў і рэалізацыі ў той ці іншай меры функцый культурна-адпачынкавай дзейнасці. Наконт дадзенага пытання ў навуковай літаратуры існуе нямала розначытанняў, аднак большасць аўтараў (М. А. Арыярскі, Я. Д. Грыгаровіч, Т. Г. Кісялёва, Ю. Д. Красільнікаў і інш.) вылучаюць развіваючую, інфармацыйна-асветніцкую, камунікатыўную, рэкрэатыўную функцыі.

Рэалізацыя развіваючай функцыі прадугледжвае пашырэнне мастацкіх уражанняў, ведаў асобы на матэрыяле фальклорных узораў, якія ўвасабляюць эстэтычныя і маральныя ідэалы беларускага народа. Засваенне паэтычных вобразаў міфаў, песенных інтанацый, фантазій, казак, удзел у каляндарных абрадах дапамагаюць гледачам – саўдзельнікам народных свят адчуць цэласнасць, глыбіню і гармонію твораў фальклору.

Інфармацыйна-асветніцкая функцыя прадугледжвае сістэматычнае пашырэнне ведаў аб сутнасці народных традыцый і іх месцы ў жыцці чалавека, аб розных жанрах фальклору, што дапамагае раскрыць асноўныя светапоглядныя канстанты традыцыйнай культуры, якія сімвалічна выражаюць і замацоўваюць адносіны людзей да прыроды і паміж сабой, іх паводзіны ў важных жыццёвых сітуацыях.

Камунікатыўная функцыя ў самым шырокім сэнсе выяўляецца праз стасункі са светам фальклору, падчас якіх удзельнікі народных свят не

толькі спазнаюць асаблівасці матэрыяльнага і духоўнага жыцця нашых продкаў, але і вучацца беражліва і паважліва ставіцца да традыцыйнай культуры, разумець яе спецыфіку. Менавіта гэта функцыя нясе ў сабе неабмежаваныя магчымасці для разумення глыбінных заканамернасцей светаўспрымання, светапогляду беларускага народа. У вузкім сэнсе камунікатыўная функцыя рэалізуецца падчас міжсуб'ектнага творчага ўзаемадзеяння паміж удзельнікамі, якое выклікае адчуванне еднасці праз агульныя перажыванні, сумесныя эмацыянальныя ўражанні.

Рэкрэатыўная функцыя народнага свята спрыяе поўнавартаснаму адпачынку людзей, аднаўленню іх фізічных і духоўных сіл. Гэта патрабуе арганізацыі актыўных забаўляльных заняткаў і забаў, якія забяспечваюць разнастайнасць дзейнасці, змену ўражанняў, станоўчы эмацыянальны настрой, зняцце напружання і стомленасці.

Найбольшую цікавасць ўяўляюць дадатковыя функцыі, якія практыкуюць уключэнне абрадава-святочнай культуры ў асяроддзе сучаснасці: функцыя засваення, прапаганды і рэканструкцыі фальклору, функцыя этнічнай самарэлізацыі ўдзельнікаў народных свят і абрадаў, функцыя пашырэння суб'екта абрадава-святочнай дзейнасці.

Функцыя засваення, прапаганды і рэканструкцыі фальклору (В. І. Аляксеева, Е. Г. Бароніна, І. І. Зямцоўскі, А. С. Кабанаў, А. С. Каргін, Д. Пакроўскі, Т. К. Саладухіна, С. А. Сітнікава і інш.) абумоўлівае распаўсюджванне і папулярызацыю фальклору ў сучасным грамадстве, вяртанне да народнай культурнай спадчыны. Культурна-адпачынкавая дзейнасць па аднаўленні свят і абрадаў спрыяе далучэнню іх удзельнікаў да фальклорных твораў на падставе іх засваення і аднаўлення, што дазваляе папулярызаваць, ахоўваць і памнажаць духоўны скарб нацыі, актыўна яго выкарыстоўваць у мэтах павышэння культурнага ўзроўню людзей.

Функцыя этнічнай самарэалізацыі ўдзельнікаў народных абрадаў і свят (Т. М. Радзевіч, Л. Л. Ражкова, С. А. Сітнікава і інш.) набывае асаблівую актуальнасць ва ўмовах знікнення асяродкаў абрадава-святочнай культуры. Далучэнне да яе як ліквідацыя адчужанасці, пранікненне ў вытокі абрадава-святочнай культуры, асэнсаванне і далейшае развіццё ў індывідуальнай і калектыўнай творчасці дазваляюць асэнсаваць сукупнасць культурных дасягненняў роднага краю і ўсвядоміць іх ролю ў будаўніцтве ўласнага жыцця.

Функцыя пашырэння суб'екта абрадава-святочнай дзейнасці (Л. Л. Ражкова, Я. І. Смірнова, М. А. Сямёнава і інш.) забяспечвае трансляцыю пераемнікам духоўнай спадчыны, развіццё здольнасці ідэнтыфікаваць сябе са сваім народам і яго культурай і фарміраваць на гэтай аснове светаўспрыманне і светапогляд асобы як мадэлі нацыянальных паводзін і дзейнасці.

Такім чынам, у дадзеным выступленні намі абгрунтаваны выхаваўчы патэнцыял абрадава-святочнай культуры, які заключаецца ў тым, што яна

прапаноўвае не толькі лагічныя схемы паводзін, але і псіхалагічныя мадэлі, увасобленыя ў мастацкіх вобразах, чым перш за ўсё ўплывае на фарміраванне эмацыянальна-пачуццёвай сферы асобы: так, чалавек не проста запамінае і лагічна ўсведамляе пэўныя грамадскія патрабаванні і каштоўнасці, але і перажывае іх. На гэтай падставе абрадава-святочная культура арыентуе чалавека ў навакольным асяроддзі і абараняе, ствараючы бар'ер для негатыўных уздзеянняў. Рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу абрадава-святочнай культуры садзейнічаюць асноўныя і дадатковыя функцыі культурна-адпачынкавай дзейнасці. Сярод асноўных функцый вылучаюцца: развіваючая, інфармацыйна-асветніцкая, камунікатыўная, рэкрэатыўная, сярод дадатковых: функцыя засваення, прапаганды і рэканструкцыі фальклору, функцыя этнічнай самарэалізацыі ўдзельнікаў народных абрадаў і свят, функцыя пашырэння суб'екта абрадава-святочнай дзейнасці.

Таццяна ХАЛАДОК
*(г.п. Акцябрскі, Гомельская вобласць)*

## МЕСЦА І РОЛЯ АКЦЯБРСКАГА РАЁННАГА ДОМА РАМЁСТВАЎ У АДНАЎЛЕННІ, ЗАСВАЕННІ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ТРАДЫЦЫЙНАГА МАСТАЦТВА

Галоўным цэнтрам развіцця рамесніцкай справы ў Акцябрскім раёне лічыцца дзяржаўная ўстанова культуры «Акцябрскі раённы дом рамёстваў», створаны ў жніўні 1998 г. Асноўнай мэтай дзейнасці ўстановы з'яўляецца развіццё народнай творчасці ва ўсіх яе праявах: вывучэнне, захаванне і прапаганда лепшых твораў народных (традыцыйных) рамёстваў, стварэнне неабходных умоў для развіцця творчых здольнасцей падрастаючага пакалення, падтрымка юных талентаў і актыўнае далучэнне да культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа.

Важнае месца ў рабоце метадысты-майстры адводзяць даследаванням стану народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў раёне. З гэтай мэтай праводзяцца экспедыцыі, інфармацыя носьбітаў рамесных традыцый фіксуецца не толькі на фотаздымкі, але і замалёўваюцца асобныя элементы традыцыйнага крою жаночага і мужчынскага адзення, тканыя і вышытыя вырабы. Вынікі экспедыцыйнай дзейнасці з'яўляюцца найкаштоўнейшым матэрыялам для далейшай работы па адраджэнні і захаванні забытых рамёстваў.

На аснове сабранага і апрацаванага матэрыялу ў творчых майстэрнях аднаўляюцца і ствараюцца калекцыі тканых ручнікоў, плеценых паясоў на «дошчачках», «на бердзечку», лялек-абярэгаў, абрадавых лялек, лялек у традыцыйнай вопратцы, калекцыі народных саламяных і гліняных цацак,